МАРОЗ ВЯРТАЕЦЦА 4

ЯК НАВУЧЫЦЦА БЫЦЬ ПІСЬМЕННІКАМ 15

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

3 ЛЮТАГА 2023 г. ПЯТНІЦА № 22 (29902)

КАРАТКА

- **Тарыфы на транзіт нафты па Беларусі выраслі на 9 працэнтаў.**
- Больш за 1,7 тысячы цяжкіх і асабліва цяжкіх эканамічных злачынстваў было раскрыта ў Беларусі летась.
- **Пасажырскі поезд Мінск — Новасібірск праз Ніжні Ноўгарад можа аднавіць курсіраванне.**
- Маладзёжная зборная Беларусі па футболе (U-21) трапіла ў групу G, дзе яе сапернікамі будуць равеснікі з Партугаліі, Харватыі, Грэцыі, Андоры і Фарэрскіх астравоў.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр БАХАНОВІЧ, першы намеснік міністра адукацыі:

«Сістэма адукацыі і яе якасць — адзін з галоўных фактараў развіцця любой краіны. Высокая якасць адукацыі заўсёды была адным з брэндаў Беларусі. Безумоўна, мы павінны захаваць яе, таму што гэта і сацыяльная стабільнасць у грамадстве, і развіццё эканомікі, і высокакваліфікаваныя кадры, якія не толькі падтрымліваюць існуючыя галіны эканомікі, але і развіваюць новыя, садзейнічаюць далейшаму росту, развіццю і росквіту нашай краіны. Якасць адукацыі — гэта перш за ўсё падрыхтоўка такіх спецыялістаў, якія ў поўнай меры адпавядаюць запытам нашых галін эканомікі і ў цэлым дзяржавы, сацыяльнай сферы. Гэта цэлы комплекс падрыхтоўкі, не толькі навучання, але і выхавання. Таму што высокакваліфікаваны спецыяліст — своеасаблівы цэнтр прыцягнення іншых людзей. Ён канцэнтруе вакол сябе працоўныя калектывы і з'яўляецца драйверам развіцця той ці іншай галіны».

ISSN 1990 — 763X

БЛІЗКІ БЛІЗКІ УСХОД

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора ўвечары правёў сустрэчу з Прэзідэнтам ААЭ шэйхам Мухамедам Бен Заідам аль-Нахаянам, паведамляе БелТА.

Фота БелТА

Сустрэча лідараў Беларусі і ААЭ адбылася ў Палацы Аль-Шаці — рэзідэнцыі кіраўніка Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў. Мухамед Бен Заід аль-Нахаян сустрэў Аляксандра Лукашэнку каля аўтамабіля, і пасля кароткага прывітання кіраўнікі дзяржаў адправіліся на перагаворы.

«Спадар Прэзідэнт, я вельмі адкрыты чалавек, таму вы ведаеце, што я пра вас думаю. Я заўсёды быў самага высокага меркавання пра вас і пра вашых сяброў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка ў пачатку сустрэчы.

«Эміраты не мяняюцца», — адказаў Прэзідэнт ААЭ.

«Мяняюцца да лепшага», — парыраваў беларускі лідар.

Кіраўнікі дзяржаў доўгі час гаварылі адзін на адзін.

Падрабязнасці ўчарашняй сустрэчы — у наступным нумары «Звязды».

Актуальна

ПАДЛІЧЫМ УСЕ ДАХОДЫ ЗА ГОД

Каму трэба падаць падатковую дэкларацыю і плаціць падатак

Дакументы аб сваіх гадавых даходах асобныя падаткаплацельшчыкі павінны накіраваць у інспекцыю не пазней за 31 сакавіка. Хто павінен прадставіць падатковую дэкларацыю за мінулы год і заплаціць падаходны падатак? Якія даходы неабходна дэкларацыяваць? Якія льготы прадугледжаны для розных катэгорый грамадзян? І якімі спосабамі прадстаўлення дэкларацыі і выплаты падаходнага падатку можна цяпер скарыстацца? На гэтыя актуальныя пытанні мы паспрабавалі адказаць сумесна з прадстаўнікамі прэс-службы Міністэрства па падатках і зборах.

СТАР. 3

Інтэгравацца ў жыццё

МЕДЫЦЫНСКАЯ ДАПАМОГА ІНВАЛІДАМ:

бясплатна, безадмоўна і ў першачарговым парадку

Медыкі настойваюць: інваліднасць — гэта нагода працаваць разам з пацыентам над тым, каб паляпшаліся стан яго здароўя і якасць жыцця. Як у нашай краіне арганізавана медыцынская дапамога інвалідам, расказвае Віктарыя ГОЛІКАВА, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт, урач вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі.

— Адны людзі кажуць: «Я дамогся прызначэння інваліднасці», а іншыя: «Урач адправіў на камісію для прызначэння інваліднасці». А хто па законе павінен ініцыіраваць гэты працэс? Якія медыцынскія інстанцыі трэба прайсці чалавеку, каб яму ўстанавілі групу інваліднасці?

— Наяўнасць прыкмет інваліднасці вызначаюць спецыялісты медыка-рэабілітацыйных экспертных камісій (МРЭК) пры правядзенні медыка-сацыяльнай экспертызы. Накіраванне на такую экспертызу выдае ўрачэбна-кансультацыйная камісія (УКК) дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя, у якой лечыцца пацыент.

СТАР. 4

Актуаліі

РАБОТУ ЖКГ НЕЛЬГА ПУСКАЦЬ НА САМАЦЁК

Усё павінна быць выбудавана дакладна і сістэмна

Аб гэтым учора ішла размова на нарадзе па пытаннях ЖКГ пад кіраўніцтвам Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ.

Фота БелТА.

«Вы ведаеце, што я шмат гадоў аддала рабоце ў службе жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Праводзячы нарады з кіраўнікамі адміністрацый і кіраўніцтвам Мінска, усялякі раз мы абмяркоўваем найбольш важныя і актуальныя пытанні, якія датычацца жыццядзейнасці нашага горада. І я палічыла неабходным запрасіць на аналагічную нараду намеснікаў кіраўнікоў адміністрацый, якія курыруюць работу жыллёва-камунальных службаў горада Мінска. Чаму? Таму што для таго, каб эфектыўна працаваць сёння па гэтых напрамках, у Мінску створаны ўсе ўмовы: сфарміраваны структуры, прадпрыемствы, арганізацыі, якія працуюць абсалютна па ўсіх напрамках. Дарбуды, будаўнічыя арганізацыі, арганізацыі зелянгасаў, праектны інстытут па добраўпарадкаванні горада. Увогуле, усё ў нас укамплектавана, спецыялісты працуюць. Фінансаванне вызначана. Прычым даволі добрае, каб выконваць тыя задачы, якія стаяць перад службамі жыллёва-камунальнай гаспадаркі па навядзенні парадку ў горадзе, капітальным і бягучым рамонце жыллёвага фонду і яго ўтрыманні, па эстэтызацыі гарадскога асяроддзя, вывазе другасных рэсурсаў і ўсяго астатняга», — сказала Наталля Качанава.

Разам з тым у Мінску вялікая колькасць зваротаў па пытаннях работы сістэмы ЖКГ, канстатавала спікер. «Гэта пацвярджаюць і тыя прыёмы, якія мы праводзім: прыходзіць вялікая колькасць людзей са скаргамі на работу жыллёва-камунальных службаў. Перш за ўсё капітальны рамонт, добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый, прылеглых да жылых дамоў, па вывазе другасных рэсурсаў і шмат іншых. Сёння ў 115 — нашу адзіную дыспетчарскую службу — дазваніцца немагчыма. А калі і дазвонішся, то гэтыя заяўкі выконваюцца з зацягваннем тэрмінаў. І людзей, вядома, гэта не задавольвае, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — На 28 працэнтаў павялічылася колькасць зваротаў у Савет Рэспублікі. У структуры зваротаў з Мінска — каля 30 працэнтаў — па пытаннях ЖКГ. Я гэтыя пытанні агучваю пастаянна на нарадах з кіраўнікамі адміністрацый. Але бачу, што выніку пакуль такога, якога хацелася б, няма».

«Што вам перашкаджае працаваць эфектыўна для выканання пастаўленых задач? Якія ёсць праблемы? Што яшчэ вам трэба зрабіць, каб вырашаць гэтыя пытанні эфектыўна? Нам шмат разоў Прэзідэнт указвае на недахопы ў рабоце ЖКГ па горадзе Мінску. Гэта і ямачны рамонт дарог (вы чулі апошняе даручэнне Прэзідэнта), асвятленне, азеляненне. Я хацела б з вамі пагаварыць як са спецыялістамі. Калі гэта работа на кантролі ў намесніка старшыні, яна выбудавана дакладна і сістэмна — ніякіх праблем не будзе. Але калі яна пушчана на самацёк або эпізадычна вырашаецца па меры ўзнікнення праблем, то абавязкова пытанні будуць узнікаць. Калі ў вас сёння ёсць нейкія праблемы па структуры, дык вы толькі скажыце. Паколькі Прэзідэнт на нарадзе ў Полацку па рабоце жыллёва-камунальнай гаспадаркі дакладны даў карт-бланш, бярыце, рабіце, як вы палічыце патрэбным на месцах», — дапоўніла Наталля Качанава.

БелТА.

ЛЕТА АКТЫЎНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ

Актыўную фазу падрыхтоўкі да адзінага дня галасавання плануецца пачаць летам. Аб гэтым заявіў журналістам перад сустрэчай з актывам Брэсцкай вобласці старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар КАРПЕНКА, перадае БелТА.

«Выбарчы кодэкс у новай рэдакцыі ў дастаткова добрай гатоўнасці. Ён быў разгледжаны і адобраны абедзвюма палатамі парламента, цяпер рыхтуецца да падпісання кіраўніком дзяржавы. Думаю, што ў найбліжэйшы час ён будзе падпісаны і ўступіць у законную сілу. Мы маркуем, што гэта адбудзецца ў канцы лютага — пачатку сакавіка. Адпаведна, пачынаем адлік падрыхтоўкі да адзінага дня галасавання — фактычна ўжо з лета мы ўступім у актыўную фазу», — сказаў старшыня ЦВК.

Да гэтага, па яго словах, будзе рыхтавацца метадычная база, якая дасць магчымасць якасна правесці адзіны дзень галасавання: выданне метадычных матэрыялаў, вучоба патэнцыяльных арганізатараў электаральнай кампаніі, семінары. Прадстаўнікі ЦВК маюць намер наведаць усе рэгіёны. Такая сустрэча, як у Брэсце, ужо прайшла ў Магілёўскай вобласці. На наступным тыдні плануецца паездка ў Віцебск.

«Зразумела, што старшыні, намеснікі старшыняў гар- і райвыканкамаў — дастаткова актыўныя суб'екты рэалізацыі выбарчых паўнамоцтваў — па фарміраванні камісій, вызначэнні акруг, участкаў для галасавання, аказанні садзейнічання ў іх абсталяванні. Мы павінны данесці тыя навацыі, якія прадугледжаны выбарчым кодэксам. Гэта сістэмная праца, якая звычайна арганізуецца ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення любой электаральнай кампаніі», — адзначыў Ігар Карпенка.

Ён акцэнтаваў увагу на зменах выбарчага заканадаўства, асаблівасцях выбарчых кампаній 2024 года.

«Канстытуцыяй прадугледжана, што выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і мясцовых Саветаў дэпутатаў будуць праходзіць у адзіны дзень галасавання ў апошнюю нядзелю лютага. Такім чынам, чарговыя выбары ў Беларусі пройдуць 25 лютага 2024 года. Згодна з патрабаваннямі Канстытуцыі, рашэнне Прэзідэнта аб прызначэнні выбараў павінна быць прынята не пазней чым за тры месяцы да адзінага дня галасавання, гэта значыць, не пазней за 23 лістапада 2023 года», — канстатаваў старшыня ЦВК.

Зыходзячы з гэтых дат, каляндар падрыхтоўкі да выбараў выглядае прыкладна так: не пазней за 1 верасня павінна быць устаноўлена сярэдняя колькасць выбарчыкаў на акругу, не пазней за 1 кастрычніка ЦВК утварае акругі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу (у Беларусі іх па-ранейшаму будзе 110), да 1 снежня будуць утвораны акругі па выбарах дэпутатаў мясцовых саветаў. Арганізацыя акруг па выбарах у сельскія і пасялковыя саветы аднесена да кампетэнцыі адпаведных выканкамаў.

Блізкая ўлада

Выканкамы на сувязі

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 4 лютага, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Васілевіч КРАЎЧУК. Тэл. 8 016 226 99 26;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый Вадзімавіч АЛЕЙНІКАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Андрэй Вацлававіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

• намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. 8 022 250 18 69;

• намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй Аляксандравіч БУГРОЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

ФІНАНСАВЫ ПАДМУРАК ДЛЯ МАЛАДЗЁЖНЫХ ІНІЦЫЯТЫЎ

Пастановай Савета Міністраў ад 31 студзеня 2023 года № 87 зацверджана Палажэнне аб парадку фарміравання, фінансавання і рэалізацыі маладзёжных ініцыятыў.

Згодна з дакументам, маладзёжныя ініцыятывы адбіраюцца на конкурснай аснове. Арганізатарам такога конкурсу выступае Міністэрства адукацыі, а паўнамоцтвамі на яго правядзенне і каардынацыю рэалізацыі маладзёжных ініцыятыў надзелена грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Інфармацыя аб правядзенні конкурсу (тэрміны, умовы, форма заяўкі і інш.) размяшчаецца на афіцыйным сайце арганізатара не пазней за месяц да яго пачатку.

Для ўдзелу ў мерапрыемстве неабходна падаць заяўку і адпаведныя дакументы.

Палажэннем вызначаны крытэрыі, па якіх праводзіцца ацэнка і адбор заявак. Да іх, у прыватнасці, аднесены: актуальнасць і сацыяльная значнасць маладзёжнай ініцыятывы; колькасны ахоп маладых грамадзян, уцягнутых у рэалізацыю маладзёжнай ініцыятывы; вопыт і кампетэнцыя выканаўцаў маладзёжнай ініцыятывы; чаканы сацыяльны, эканамічны і іншыя эфекты ад рэалізацыі маладзёжнай ініцыятывы (чаканыя змяненні ў сацыяльнай, эканамічнай і іншых сферах жыцця, якія адбываюцца ў выніку дзеяння), прадугледжаных маладзёжнай ініцыятывай); даступнасць вынікаў рэалізацыі маладзёжнай ініцыятывы для насельніцтва; інавацыйнасць падыходаў, прапанаваных у рамках рэалізацыі маладзёжнай ініцыятывы; забеспячэнне магчымасці падтрымання або развіцця вынікаў, дасягнутых у рамках маладзёжнай ініцыятывы пасля завяршэння яе рэалізацыі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У ЗША паведамілі аб запаволенні тэмпаў развіцця эканомікі

У Федэральнай рэзервовай сістэме ЗША паведамілі аб рызыках інфляцыі, якая, па словах старшыні рэгулятара, значна вышэй мэтавага паказчыка. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на старшыню ФРС Джэрома Паўэла. Паводле яго інфармацыі, Федэральная рэзервовая сістэма ЗША, якая выконвае функцыі цэнтрабанка краіны, зарэгістравала істотнае запаволенне ў развіцці амерыканскай эканомікі за мінулы год. Старшыня ФРС удакладніў, што рэальны ВУП рос тэмпамі ніжэй за адзін працэнт. Такія даныя паказваюць на ўмераны рост выдаткаў і вытворчасці ў бягучым квартале. Джэром Паўэл падкрэсліў, што фінрэгулятар «занепакоены рызыкамі, якія нясе інфляцыя, і мае цвёрды намер вярнуць яе да мэтавага паказчыка ў 2 працэнты».

У Пакістане затрыманы 23 падазроныя ў датычнасці да выбуху ў Пешавары

У Пакістане затрыманы 23 чалавекі, якіх падазраюць у датычнасці да выбуху ў мячэці ў пакістанскім горадзе Пешавар. Аб гэтым паведаміла Agence France-Presse. Паводле інфармацыі праваахоўных органаў, затрыманы таксама супрацоўнікі паліцыі ў рамках расследавання таго, як узрыўчатка магла апынуцца ў ахоўнай зоне. Сярод затрыманых ёсць жыхары Пешавара і выхадцы з мясцовасці на граніцы з Афганістанам. Паліцыя праводзіць праверкі, каб высветліць, як злачынец змог прайсці ў раён мячэці, што знаходзіцца ў частцы горада, якая асабліва ахоўваецца. Паводле інфармацыі супрацоўнікаў пакістанскіх органаў бяспекі, тэрарыст-смяротнік прывёў у дзеянне выбуховую прыладу падчас паўдзённай малітвы ў мячэці. Загінулі больш чым 100 чалавек, каля 200 атрымалі траўмы, пры гэтым пераважная большасць памерлых з'яўляюцца супрацоўнікамі паліцыі.

Прэзідэнт Балгарыі распусціў парламент і прызначыў выбары на 2 красавіка

Прэзідэнт Рэспублікі Балгарыя Румэн Радзеў падпісаў указ аб роспуску парламента і назначэнні датэрміновых выбараў на 2 красавіка. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на прэс-службу балгарскага лідара. «На падставе Канстытуцыі прэзідэнт Румэн Радзеў падпісаў указ аб роспуску 3 лютага 48-га народнага сходу», — адзначаецца ў паведамленні прэс-службы. Таксама кіраўнік дзяржавы падпісаў указ аб прызначэнні з 3 лютага новага тэхнічнага ўрада на чале з Гылыбам Доневым. Румэн Радзеў прапанаваў дэпутатам у перыяд з 3 лютага да 2 красавіка на справе даказаць, што для іх з'яўляецца рэальнымі прыярытэтамі. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што барацьба з карупцыяй, інтэграцыя і план па аднаўленні ўстойлівасці не павінны быць пустымі перадвыбарнымі абяцаннямі.

ПАДЛІЧЫМ УСЕ ДАХОДЫ ЗА ГОД

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Падатковую дэкларацыю абавязаны прадставіць тыя асобы, якія атрымалі ў 2022 годзе даходы: ад продажу маёмасці, у выніку дарэння, атрыманыя з-за мяжы або за мяжой, асобныя даходы, на якія чалавеку быў вызначаны сацыяльны падатковы вылік.

Не забываем прададзеныя машыны, кватэры, дамы і іншую нерухомасць

Самая вялікая катэгорыя плацельшчыкаў — асобы, якія атрымліваюць даходы ад продажу нерухомай маёмасці і транспартных сродкаў. Але тут ёсць асаблівасці. Калі на працягу года прададзены два і больш легкавыя аўтамабілі, то з другой і наступных аўтамашын трэба аплачваць падаходны падатак. Калі прададзены грузавы аўтамабіль масай звыш 3,5 тоны або аўтобус з больш чым 8 пасадачнымі месцамі, то нават адна адзінка гэтай маёмасці абкладаецца падаткам.

Што датычыцца нерухомасці, тут гаворка ўжо ідзе не аб адным, а аб пяці гадах. Калі на працягу пяці апошніх гадоў прададзены дзве кватэры, два жылыя дамы, два зямельныя ўчасткі, даходы ад другога аб'екта продажу ўжо абкладаюцца падаткам. Але гэта датычыцца дзвюх аднатыпных адзінак маёмасці, напрыклад дзвюх кватэр. А калі прададзеныя, напрыклад, кватэра і жылы дом, то ні тое, ні другое не абкладаецца падаткам.

Але тут варта адзначыць адзін важны момант пры продажы нерухомасці. Ільгота па адным адчужэнні даецца толькі ў дачыненні да кватэр, жылых дамоў, садовых домікаў (дач), зямельных участкаў, гаражоў і машына-месцаў. Калі прадаецца любая іншая нерухомасць, напрыклад, камерцыйная (офісы, гандлёвыя будынкі), то нават аднаразовы продаж абкладаецца падаткам.

Ёсць, зноў жа, выключэнне з правілаў. Прадаваць у кароткі тэрмін можна любую колькасць дамоў, дач або зямельных участкаў і іншую нерухомасць, калі ўсё гэта было атрымана ў спадчыну. Плаціць падатку ў гэтым выпадку не трэба, незалежна ад перыядычнасці адчужэння нерухомасці на працягу пяцігадовага перыяду.

Падарункі лепш падлічыць

Што рабіць з тымі даходамі, якія ў мінулым годзе вы атрымлівалі ў выніку дарэння ў выглядзе нерухомай маёмасці па дагаворы рэнты бясплатна ад фізічных асоб? Правільна, іх трэба ўлічваць.

Падарункі ад асоб, якія не адносяцца да блізкіх сваякоў, ад сяброў, напрыклад, абкладаюцца падаходным падаткам. Але ёсць падатковая льгота: сума да 8078 рублёў, атрыманая летась, падаткам не абкладаецца.

Выключэнне складаюць даходы, атрыманыя ад блізкіх сваякоў і асоб, якія знаходзяцца з ім у адносінах уласцівасці, апекуна, папячыцеля і падапечнага. Такія даходы не прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання падаходным падаткам незалежна ад атрыманага памеру.

Да асоб, якія знаходзяцца ў адносінах блізкага сваяцтва, адносяцца бацькі (усынавіцелі, удачарыцелі), дзеці (у тым ліку ўсыноўленыя), родныя браты і сёстры, дзед, бабка, унукі, прадзед, прабабка, праўнукі, муж і жонка. Да асоб, якія знаходзяцца ў адносінах уласцівасці, ставяцца блізкія сваякі іншага сужэнца, у тым ліку памерлага, абвешчанага памерлым.

Даходы, атрыманыя з-за мяжы або за мяжой

Спачатку трэба вырашыць пытанне рэзідэнцтва. Дэкларацыю падаюць работнікі, якія прызнаны ў 2022 годзе падатковымі рэзідэнтамі нашай краіны і якія атрымалі даходы з-за мяжы або за мяжой.

Рэзідэнты — гэта тыя асобы, якія фактычна знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі ў каляндарным годзе больш за 183 дні. Да часу фактычнага знаходжання на тэрыторыі краіны адносіцца час непасрэднага знаходжання асобы ў краіне, а таксама час, на які гэта асоба выязджала за межы краіны: на лячэнне, у камандзіроўку ў адпаведнасці з заканадаўствам, на адпачынак, пры ўмове, што час знаходжання на такім адпачынку ў сукупнасці па ўсіх выездах за межы краіны на працягу каляндарнага года склаў не больш за 60 каляндарных дзён.

Калі фізічная асоба адначасова з'яўляецца падатковым рэзідэнтам Беларусі і замежнай дзяржавы, але міжнародны дагавор нашай краіны па пытаннях падаткаабкладання з такой дзяржавай не падпісаны і (або) не ўжываецца, альбо калі такая асоба не з'яўляецца падатковым рэзідэнтам ніводнай дзяржавы, то яна прызнаецца падатковым рэзідэнтам Беларусі, калі ў каляндарным годзе, за які вызначаецца падатковае рэзідэнцтва, мае грамадзянства Рэспублікі Беларусь або дазвол на пастаяннае пражыванне ў краіне (від на жыхарства).

Прыкладам даходаў, атрыманых з-за мяжы або за мяжой, могуць быць наступныя: ад работы па найме (кантракта); ад продажу акцый або іншых каштоўных папер; ад продажу долі ў статутных фондах замежных арганізацый; у выглядзе працэнтаў па рахунках (укладах) у замежных банках; атрыманыя ў дар ад замежных грамадзян і іншыя.

Асноўная маса даходаў з-за мяжы — гэта заработная плата, дывідэнды, працэнты па рахунках і ўкладах у замежных банках, выйгрышы ў замежных анлайн-казіно і на рынку «Форэкс». Дык вось, фактычна выплачаныя сумы падатку ў замежнай дзяржаве падлягаюць заліку пры вызначэнні сумы падаходнага падатку. Тут галоўнае — даць неабходныя дакументы. Гэты дакумент на сёння павінен быць завераны падатковай службай замежнай дзяржавы.

Вялікі пласт займаюць і грашовыя пераводы ад іншых грамадзян. Калі гэта блізкія сваякі (бацькі, дзеці, родныя браты і сёстры, дзядулі і бабулі, унукі), то падаходным падаткам гэтыя даходы не абкладаюцца незалежна ад іх памеру і падаваць падатковую дэкларацыю не патрабуецца. Тое ж адносіцца і да блізкіх сваякоў мужа. Калі мама вашай жонкі вам нешта падорыць з-за мяжы, вы падатак з гэтай сумы плаціць не будзеце.

Будаўніцтва спынена, а вам давалі сацыяльны падатковы вылік

Па выніках года дэкларуецца і даход, атрыманы грамадзянінам праз механізм вяртання раней унесеных сродкаў пры спыненні будаўніцтва жылля, а таксама ў выпадку патаннення такога будаўніцтва альбо выбыцця фізічнай асобы з членаў арганізацыі забудоўшчыкаў.

Эксперты міністэрства адзначаюць, што вернутыя пры гэтым грашовыя сродкі, у тым ліку паявыя ўзносы, абкладаюцца падаходным падаткам у выпадку, калі на такія ўзносы раней была дадзена льгота ў выглядзе маёмаснага падаткавага выліку.

Трэба дэкляраваць таксама і даходы, якія былі атрыманы ў выглядзе грашовых сродкаў пры датэрміновым пагашэнні жыллёвых аблігацый, а таксама ў выглядзе вяртання грашовых сродкаў, унесеных у аплату кошту жылога памяшкання шляхам набыцця жыллёвых аблігацый, у выпадку невыканання забудоўшчыкам абавязацельстваў па дамове. Дэкларацыя падаецца ў тым выпадку, калі па ўнесеных сумах для набыцця жыллёвых аблігацый раней быў праведзены маёмасны падатковы вылік.

Такі ж механізм прадугледжаны, калі адмяняецца вылік на даходы ў выглядзе лізінгавых плацяжоў, якія выплачаны па дагаворы фінансавай арэнды, што прадугледжвае выкуп прадмета лізінгу — аднакватэрнага жылога дома або кватэры ў выпадках, калі такі дагавор не завяршыўся выкупам маёмасці або ў дагавор былі ўнесены змены, якія выключаюць умовы выкупу прадмета лізінгу.

Такім чынам, былы забудоўшчык, які атрымаў у мінулым годзе такія грашовыя сродкі, абавязаны заплаціць падаходны падатак у дачыненні да сум, на якія яму раней была выдзелена льгота ў выглядзе маёмаснага падаткавага выліку.

Калі тэрмін падачы дэкларацыі не абмежаваны па часе

Сярод нас ёсць і тыя, хто можа падаць у інспекцыю дэкларацыю з мэтай атрымання падатковых вылікаў. У прыватнасці, гэта датычыцца людзей, якія атрымлівалі ў мінулым годзе аўтарскія ўзнагароджанні або ўзнагароджанні за стварэнне, выкананне або іншае выкарыстанне твораў навукі, літаратуры і мастацтва, выплаты аўтарам вынаходак, карысных мадэляў, прамысловых узораў і іншых вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці.

Дэкларацыю варта запоўніць таксама спартсменам і іх трэнерам, якія атрымлівалі даходы ад асабістай дзейнасці за ўдзел у спартыўных спаборніцтвах пры ўмове, што такая дзейнасць ажыццяўлялася імі не ў рамках каманднага ўдзелу. Якімі падатковымі льготамі (вылікамі) можа скарыстацца фізічная асоба?

Стандартныя падатковыя вылікі:

— у памеры 135 рублёў у месяц пры атрыманні даходу, які падлягае падаткаабкладанню, у суме, якая не перавышае 817 рублёў у месяц;

— у памеры 40 рублёў (75 рублёў) у месяц на дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, навучэнцаў і студэнтаў дзённага аддзялення ці іншых утрыманцаў;

— у памеры 190 рублёў у месяц для асобных катэгорый фізічных асоб.

Сацыяльныя падатковыя вылікі:

— у суме выдаткаў на навучанне (сваё, дзяцей, іншых блізкіх сваякоў);

— на выплату страхавых узносаў па дагаворах добраахвотнага страхавання.

Маёмасныя падатковыя вылікі:

— у суме выдаткаў на будаўніцтва або набыццё аднакватэрнага жылога дома або кватэры;

— у суме выдаткаў, панесеных на набыццё маёмасці, даходы ад продажу якога падлягаюць падаткаабкладанню;

— у памеры 20 % сумы даходаў, якія падлягаюць падаткаабкладанню, атрыманых ад адчужэння маёмасці.

Прафесійныя падатковыя вылікі:

— у суме выдаткаў на стварэнне аб'екта аўтарскага права;

— у памеры 20 %, 30 %, 40 % сумы аўтарскага ўзнагароджання;

— у суме выдаткаў, звязаных з удзелам спартсменаў і іх трэнераў у спартыўных спаборніцтвах, пры ўмове, што такая дзейнасць ажыццяўляецца не ў рамках каманднага ўдзелу;

— у памеры 20 % сумы даходаў, якія падлягаюць падаткаабкладанню, атрыманых спартсменамі і іх трэнерамі ад ажыццяўлення асабістай дзейнасці за ўдзел у спартыўных спаборніцтвах.

Што трэба зрабіць, каб вярнуць падатак?

Спачатку трэба падаць у інспекцыю падатковую дэкларацыю за мінулы год і адлюстраваць у ёй звесткі аб атрыманых даходах. Да дэкларацыі абавязкова павінна быць прыкладзена даведка ад падатковага агента аб налічаным даходзе і ўтрыманым падатку па ўсталяванай форме. Далей трэба адлюстраваць у падатковай дэкларацыі звесткі аб праве фізічнай асобы на атрыманне пэўных падатковых ільгот.

Да дэкларацыі абавязкова павінны быць прыкладзены дакументы, якія пацвярджаюць права фізічнай асобы на атрыманне падатковых ільгот. Пасля таго, як падатковы орган зробіць перараслік падаходнага падатку і разлічыць суму падатку да вяртання, напісаць заяву на вяртанне падатку па пэўнай форме.

Вяртанне падатку ажыццяўляецца двума спосабамі: на рахунак, адкрыты ў банку, уключаючы карт-рахунак; наяўнымі грашовымі сродкамі з касы банка, у якім абслугоўваецца падатковы орган.

Калі фізічная асоба жадае вярнуць падатак на свой банкаўскі рахунак, то ў заяве на вяртанне падатку неабходна ўказаць рэквізіты банкаўскага рахунку: нумар і тып рахунку, найменне банка, код банка, код валюты. На працягу 15 рабочых дзён з моманту падачы заявы на вяртанне падатку атрымаць грошы.

І яшчэ. Для плацельшчыкаў, якія падаюць падатковую дэкларацыю выключна з мэтай атрымання падатковых вылікаў па падаходным падатку, тэрмін яе прадстаўлення не абмежаваны 31 сакавіка.

Лепш не хадзіць, а падаць дыстанцыйна

Фактычна ёсць тры асноўныя спосабы падачы падатковай дэкларацыі: асабіста шляхам наведвання падатковага органа, па пошце і ў электронным выглядзе. У першым выпадку фізічная асоба запаўняе дэкларацыю і з пашпартам звяртаецца ў падатковы орган. У нас дзейнічае прынцып экстэрытарыяльнасці абслугоўвання. Гэта значыць, чалавек звяртаецца ў любую інспекцыю, незалежна ад таго, дзе ён пражывае, дзе зарэгістраваны, дзе знаходзіцца на падатковым уліку. Напрыклад, калі вы прапісаныя ў Віцебску, але жывяце і працуеце ў Мінску, можаце спакойна звярнуцца ў любую падатковую, як вам будзе зручна. Там усё зробяць, паведамленне на выплату вы атрымаеце.

Другі спосаб — падача дэкларацыі праз паштовую сувязь. З любой даведачнай сістэмы альбо з афіцыйнага сайта падатковых органаў можна спампаваць бланк дэкларацыі, запоўніць яго ўручную або на камп'ютары, раздрукаваць, падпісацца і накіраваць па пошце. У гэтым выпадку дата падачы дэкларацыі — дзень паштовага адпраўлення. Калі хтосьці не паспявае звярнуцца ў падатковы орган, ён можа 31 сакавіка адправіць дэкларацыю. Хоць яна прыйдзе ўжо ў красавіку, чалавек тэрмін не парушыць.

Самы перспектыўны на сёння спосаб — падача ў электронным выглядзе. Тут ёсць важная асаблівасць. Чалавеку неабходна аднаразова звярнуцца ў любы падатковы орган з пашпартам, каб зарэгістравацца ў асабістым кабінеце плацельшчыка, атрымаць уліковы запіс і пароль. Вялікая перавага ў тым, што дэкларацыю ў электронным выглядзе можна падаць з любога пункту свету, не трэба нікуды ездзіць. Другі вельмі важны плюс у тым, што такім плацельшчыкам бліжэй да канца студзеня ўжо ўяўляецца папярэдне запоўненая форма дэкларацыі.

Парушэнні і пакаранні

Калі кліент падатковай «забыўся» падаць дэкларацыю, па якой ён павінен выплаціць падаткі і пратэрміноўка склала больш за 30 рабочых дзён, яму выставяць штраф у памеры 0,5 базавай велічыні з павелічэннем яго на 0,5 БВ за кожны поўны месяц пратэрміноўкі, але не больш за 10 базавых велічынь.

Парушэнне фізічнай асобай тэрміну аплаты падаходнага падатку (1 чэрвеня 2023 года), які робіцца на падставе прадстаўленай падатковай дэкларацыі за 2022 год, **калі нявыплачаная або не цалкам выплачаная сума падатку перавышае адну базавую велічыню,** цягне накладанне штрафу ў памеры 15 % ад нявыплачанай сумы падатку, але не менш за 0,5 базавай велічыні.

Сяргей КУРКАЧ.

МЕДЫЦЫНСКАЯ ДАПАМОГА ІНВАЛІДАМ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На пасяджэнне УКК пацыента накіроўвае ўрач пасля правядзення дыягностыкі, а таксама пасля завяршэння лячэння і медыцынскай рэабілітацыі.

Пры наяўнасці прыкмет інваліднасці пацыенту, якому больш за 18 гадоў, устанаўліваецца група інваліднасці і яе прычына, дата наступлення і тэрмін інваліднасці.

Трэба разумець, што інваліднасць — гэта такое парушэнне здароўя, якое перашкаджае чалавеку ўдзельнічаць у жыцці грамадства нароўні з іншымі людзьмі. Паколькі гаворка ідзе аб парушэнні здароўя, то працэс ініцыруе ўрач, які лечыць пацыента.

— «Мы адначасова з суседкай лячыліся ў анкадыспансеры, толькі ёй далі інваліднасць, а я ўсё не магу яе дамагчыся», — выказвае крыўду наша 53-гадовая чытачка.

— Падставай для ўстанаўлення інваліднасці ў дарослых пацыентаў з'яўляецца наяўнасць абмежавання адной або некалькіх катэгорый жыццядзейнасці з ліку базавых: здольнасць да самастойнага перамяшчэння і самаабслугоўвання, да арыентацыі і да зносін, кантролю сваіх паводзін, а не наяўнасць захворвання, у прыватнасці анкалагічнага.

Акрамя таго, інваліднасць устанаўліваецца пры ўмове наяўнасці абсалютна неспрыяльнага клініка-працоўнага прагнозу на найбліжэйшы час, а таксама сумнеўнага або адносна-неспрыяльнага клініка-працоўнага прагнозу. Гэтаксама ўлічваецца факт завяршэння ці неабходнасці далейшага працяглага лячэння пацыента.

— У якіх выпадках групу інваліднасці чалавек атрымлівае пажыццёва, у якіх — трэба зноў ісці на камісію? «Бацьку ампутавалі частку рукі, і ён павінен хадзіць на перагляд, як быццам рука можа вырасці, а ў яго суседкі «нешта з галавой» і інваліднасць прызначана пажыццёва», — звяртаецца чытач...

— Думаю, не варта прыводзіць пералік анатамічных дэфектаў, пры якіх дарослым пацыентам устанаўліваецца інваліднасць пажыццёва. Цяпер усе нарматыўныя прававыя дакументы знаходзяцца ў адкрытым доступе. Пытанне ж чытача, сапраўды, вельмі папулярнае. Пры наяўнасці захворванняў з устойлівымі незваротнымі парушэннямі функцый органаў і сістэм арганізма неабходна назіранне спецыялістаў МРЭК на працягу не менш як трох гадоў, бо ўстанаўленне інваліднасці ў большасці выпадкаў суправаджаецца фарміраваннем індывідуальнай праграмы медыцынскай рэабілітацыі, абілітацыі інваліда або праграмы рэабілітацыі пацярпелага ў выніку няшчаснага выпадку, прафесійнага захворвання. Спецыялісты МРЭК пры правядзенні агляду абавязаны правесці аналіз выканання назначаных рэкамендацый і іх эфектыўнасць. Ад гэтага будзе залежаць рашэнне аб устанаўленні той ці іншай групы інваліднасці, магчыма, спатрэбіцца складанне новых рэабілітацыйных праграм, улічваючы ў тым ліку прызначанне тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі.

Задача медыкаў — максімальна дапамагчы чалавеку аднавіць здароўе, каб палепшыць якасць жыцця. І калі пацыент гатовы актыўна ўдзельнічаць у гэтым працэсе, то вынік будзе значна лепшы.

— Для многіх людзей наяўнасць групы інваліднасці асацыіруецца з сацыяльнымі льготамі, а што яна дае з пункту гледжання медыцыны?

— У кожнай дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя інваліды забяспечваюцца ўсімі відамі кваліфікаванай медыцынскай дапамогі, у тым ліку спецыялізаванай і высокатэхналагічнай, — безадмоўна, бясплатна і ў першачарговым парадку.

Практычна ўсе арганізацыі аховы здароўя забяспечаны безбар'ерным асяроддзем для шырокага доступу інвалідаў да медыцынскіх паслуг. Інвалідам праводзяцца комплексныя медыцынскія агляды, ажыццяўляецца дыспансернае назіранне, лячэнне, медыцынская рэабілітацыя і медыцынская абілітацыя ў амбулаторных і стацыянарных умовах. Для больш эфектыўнага лячэння ў стацыянарных умовах даецца магчымасць іншай асобе знаходзіцца разам з інвалідам I групы ў гэтай арганізацыі аховы здароўя і ажыццяўляць догляд.

Інваліды I і II груп маюць права на 90-працэнтную скідку з кошту лекаў, якія выдаюцца па рэцэптах урачоў у межах пераліку асноўных лекавых сродкаў. Інваліды з хірургічнымі захворваннямі пры наяўнасці заключэння УКК дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя забяспечваюцца перавязачнымі матэрыяламі. Інваліды III групы маюць права на 50-працэнтную скідку з кошту лекавых прэпаратаў, якія выдаюцца па рэцэптах урачоў для лячэння захворвання, якое прывяло да інваліднасці.

Інваліды I і II груп маюць права на бясплатны выраб і рамонт зубных пратэзаў, за выключэннем зробленых з каштоўных металаў, металаакрылатаў, металакампазітаў, металакерамікі і фарфору, а таксама нанясення пакрыцця з нітрыд-тытану ў дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя.

Важнай падтрымкай з'яўляецца забеспячэнне інвалідаў тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі. Іх больш за 50 пазіцый: ад простых мыліц да супрацьпролежневых матрацаў і слыхавых апаратаў.

Акрамя таго, інваліды I групы забяспечваюцца падгузкамі і іншымі сродкамі гігіены на падставе заключэння УКК дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя пры наяўнасці шэрагу захворванняў.

Непрацоўныя інваліды I і II груп маюць права на першачарговае бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне або аздараўленне пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў і адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў. А асобы, якія суправаджаюць інвалідаў I групы ў санаторыі, забяспечваюцца пуцёўкамі бясплатна пры наяўнасці заключэння УКК дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя аб неабходнасці суправаджэння.

Аднак пералічаныя льготы не распаўсюджваюцца на асоб, інваліднасць якіх наступіла ў выніку супрацьпраўных дзеянняў, з прычыны алкагольнага, наркатычнага, таксічнага ап'янення, членашкодніцтва.

— Чаму існуе менавіта тры групы інваліднасці?

— Гістарычна так склалася. Трохгрупавая класіфікацыя інваліднасці была прынята ў 1932 годзе, у аснову якой лёг «прынцып вызначэння працаздольнасці, зыходзячы з магчымасці для інваліда ў залежнасці ад яго стану здароўя выконваць якую-небудзь прафесійную працу або працу ў сваёй ранейшай прафесіі».

У адпаведнасці з дадзенай класіфікацыяй да I групы адносіліся асобы, якія цалкам страцілі працаздольнасць і маюць патрэбу ў пабочным доглядзе; да II групы — якія страцілі цалкам здольнасць да прафесійнай працы як па сваёй, так і па іншай прафесіі; да III групы — непрацаздольныя да сістэматычнай працы па сваёй прафесіі ў звычайных умовах працы для гэтай прафесіі, але якія могуць выкарыстоўваць сваю астаткавую працаздольнасць на нерэгулярнай працы, пры скарочаным працоўным дні або ў іншай прафесіі са значным зніжэннем кваліфікацыі.

Цяпер падыходы зусім іншыя і ахопліваюць усю сферу жыццядзейнасці чалавека.

— Вельмі шмат пытанняў узнікае з нагоды працоўнай і непрацоўнай групы інваліднасці...

— Цяпер у нарматыўных прававых актах, якія рэгламентуюць устанаўленне інваліднасці, адсутнічае паняцце працоўнай і непрацоўнай групы. Незалежна ад групы інваліднасці, у пацыентаў ацэньваецца здольнасць да працоўнай дзейнасці і клініка-працоўны прагноз.

Спецыялісты супастаўляюць вынікі медыцынскага агляду пацыента з патрабаваннямі, якія прад'яўляюцца прафесіяй да яго стану здароўя, умовамі і характарам працы пацыента, магчымасцю іх негатыўнага ўплыву на стан здароўя пацыента. Абавязкова ўлічваецца здольнасць пацыента ажыццяўляць працоўную дзейнасць, якая адпавядае яго кваліфікацыі. Па выніках гэтай ацэнкі фарміруюцца працоўныя рэкамендацыі. Не выключана, што ў некаторых выпадках працоўная дзейнасць будзе супрацьпаказана чалавеку.

— Усе людзі розныя: для адных інваліднасць — нібыта вышэйшае дасягненне ў жыцці, іншыя гэты факт не надта афішуюць. У чым памылка тых людзей, якія не паведамляюць наймальніку аб інваліднасці?

— Сапраўды, людзі маюць розныя жыццёвыя арыенціры і каштоўнасці. Трэба разумець: нягледзячы на навукова-тэхнічны прагрэс, сацыяльна-эканамічнае развіццё дзяржавы, жыццё інвалідаў прадаўжае заставацца, на жаль, вельмі складаным. Аднак у многіх з іх ёсць мэта максімальна інтэгравацца ў жыццё грамадства на ўмовах раўнапраўя, і яны не просяць, каб да іх ставіліся з жалем, хоць і маюць патрэбу часам у дапамозе навакольных. Іншыя, наадварот, патрабуюць усебаковай увагі, абароны і дапамогі.

Наймальніку абавязкова трэба ведаць аб наяўнасці інваліднасці ў работніка, таму што ён павінен стварыць для яго адпаведныя ўмовы працы. Пры спрыяльных абставінах чалавек зможа даўжэй быць эканамічна незалежным і сацыяльна адаптаваным. Хаваючы факт інваліднасці, работнік можа прычыніць шкоду свайму здароўю.

Маргарыта ДРАЗДОВА.

У 2022 годзе медыцынскую рэабілітацыю з запаўненнем індывідуальнай праграмы медыцынскай рэабілітацыі, абілітацыі пацыента ў стацыянарных і амбулаторных аддзяленнях атрымала больш за 80 000 інвалідаў, у тым ліку дарослых — больш за 60 000. У нашай краіне функцыянуе 331 аддзяленне медыцынскай рэабілітацыі, з іх 99 стацыянарных аддзяленняў, у якіх 4715 ложкаў. У амбулаторных умовах аказваюць дапамогу ў 232 аддзяленнях медыцынскай рэабілітацыі.

Надвор'е

ВЯРТАННЕ МАРОЗНАЙ ЗІМЫ

На наступным тыдні плюсавай тэмпературы ўжо і днём не будзе (у панядзелак — да мінус 14)

У першы месяц года надвор'е было і адлігавае, і марознае, калі дажджы змянялі снегапады з завеямі. А ў цэлым студзень аказаўся цёплы. Сярэдняя тэмпература паветра нашай краіны перавысіла кліматычную норму на 3,4 градуса. Апошні зімовы месяц таксама пачаўся з цёплага надвор'я. Цыкланічныя атмасферныя франты прынеслі ападкі рознай інтэнсіўнасці і яшчэ добра прагрэтыя паветраныя масы з Атлантыкі. Але ўжо ў найбліжэйшы час сінаптычны характар пачне мяняцца. Нас чакаюць пахаладанне, кароткачасовы снег і галалёдзіца, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У гэтыя выхадныя ўмовы надвор'я абумовіць няўстойлівая і халодная паветраная маса, якая паступае з поўначы Еўропы. У аблоках з'явяцца праясненні, таму ёсць надзея ўбачыць доўгачаканае сонца. Тэмпературны фон панізіцца. У суботу месцамі па краіне пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог утворыцца галалёдзіца. Уначы тэмпература паветра апусціцца да 3—10 градусаў ніжэй за нуль, пры праясненнях будзе да мінус 12. Удзень прагназуецца ад мінус 6 градусаў да 1 цяпла.

У нядзелю марозна будзе ўжо і днём, і ноччу. У гэты дзень месцамі па краіне чакаецца кароткачасовы снег, на асобных участках дарог галалёдзіца. Уначы тэмпература паветра будзе вагацца ад мінус 5 да мінус 12 градусаў, удзень — ад мінус 1 градуса да 7 марозу.

Паводле папярэдняга прагнозу айчынных сіноптыкаў, марознае надвор'е захаваецца і ў пачатку наступнага тыдня. У панядзелак месцамі па краіне чакаецца кароткачасовы снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе ў межах мінус 5—12 градусаў, пры праясненнях слупок тэрмометра апусціцца да 14 марозу. Днём тэмпература паветра складзе мінус 1—7 градусаў.

У аўторак-сераду месцамі па краіне пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог будзе галалёдзіца. Уначы тэмпература будзе ў межах мінус 4—11 градусаў, пры праясненнях — да мінус 14. Днём прагназуецца 1—7 градусаў ніжэй за нуль.

Дарэчы, нягледзячы на складаныя ўмовы надвор'я, азімыя культуры на большасці палёў валодаюць нармальнай жыццяздольнасцю.

Паводле інфармацыі аграметэаролагаў, азімыя культуры па выніках вырошчвання, праведзенага ў канцы студзеня, выявілі нармальны стан культур. У большасці адабраных узораў азімых культур назіралася поўнае адрастанне або зрэджанасць была нязначнай. Некалькі павышаная зрэджанасць адзначана ў адзінкавых пробах рапсу. Горшы стан азімага рапсу ў Гомельскай вобласці — больш чым у 40 % пробаў зарэгістраваная павышаная і значная зрэджанасць: адбылося частковае вымярзанне слабаразвітых пасеваў з-за нізкіх тэмператур і недастатковага снежнага покрыва ў першай дэкадзе студзеня.

Як адзначаюць спецыялісты, у канцы гэтага тыдня пад уплывам паступовага пахаладання расліны будуць аднаўляць сваю марозаўстойлівасць.

Сяргей КУРКАЧ.

Медыявымяральнік

ЯК МЫ ГЛЯДЗЕЛІ ТЭЛЕВІЗАР У СТУДЗЕНІ

У першы месяц года рэйтынг тэлебачання ў нашай краіне вырас амаль на 2,5 працэнта ў параўнанні са снежнем. У сярэднім амаль 62 працэнты насельніцтва штодня ўключалі тэлевізар.

Павялічыўся і сярэднясутачны час прагляду, а вось ахопліванне аўдыторыі (сярэдняя колькасць чалавек, якія ўключалі тэлевізар хоць бы на адну хвіліну за суткі) трошкі знізілася.

Максімальны аб'ём аўдыторыі прыпадаў па-ранейшаму на вячэрнія гадзіны: паміж паловай шостай да адзінаццаці — і ў будзённыя дні, і ў выхадныя. Пры гэтым глядацкая актыўнасць значна вышэйшая ў суботу і нядзелю пасля паловы дзявятай раніцы.

Сярод тэлегледачоў захоўвалася большая доля жанчын (61 працэнт), трошкі зменшылася колькасць дзяцей, моладзі і людзей ва ўзросце з 55 да 64 гадоў і павялічылася ў групах 35—54 гады і 65+.

У топе пяці запатрабаваных жанраў змен не адбылося: кіно, забаўляльныя праграмы, навіны, пазнавальныя праграмы, музыка. Пры гэтым запыт на фільмы, навіны і сацыяльна-палітычныя праграмы перавышае прапанову.

У студзені падраслі ў параўнанні са снежнем рэйтынгі ў каналаў СТБ, «РТР-Беларусь», «Беларусь 3», «Беларусь 5» і ВТБ.

Сярод 15 самых рэйтынгавых праграм большасць паказаў «РТР-Беларусь». У топе «Весткі тыдня» сярэдзіны месяца, «Прывітанне, Андрэй!» (21 студзеня), «Песні ад усёй душы» (8 студзеня), вячэрнія «Весткі» за 8 студзеня, «Прэм'ера года», «Песня года», «Гумар года», «Беларусь. Навіны» (21 студзеня) названага канала, а таксама «Поле цудаў» (20 студзеня) АНТ, «Сёння» (14 студзеня), «Суперстар. Вяртанне» ў першы дзень года і «Цэнтральнае тэлебачанне» напрыканцы месяца «НТБ-Беларусь».

Даныя справаздачы па тэлеглядзенні дала кампанія «Медыявымяральнік».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 184

28 студзеня адбылася справаздачна-выбарная канферэнцыя ГА «Беларуская федэрацыя шашак». У выканкам грамадскай арганізацыі «Беларуская федэрацыя шашак» выбраны: старшыня — Аніська Віталь Аляксандравіч, намеснікі старшыні — Барашка Ганна Бенямінаўна і Варушыла Віталь Сямёнавіч. Адказны сакратар — Хайнюк Кірыл Валер'евіч.

Члены выканкама — Аніська Аляксандр Уладзіміравіч, Валюк Андрэй Станіслававіч, Кадзеснікаў Мікалай Пятровіч, Карчынскі Сяргей Аляксандравіч, Лагуцкі Сяргей Пятровіч, Навіцкая Марына Пятроўна, Насевіч Сяргей Антонавіч, Пашкевіч Ірына Сямёнаўна.

№ 17

Першыя дзве кампазіцыі склаў Валерый Кручкоў (г. Кагарлык, Кіеўская вобласць).



№ 17

Белыя простыя: b2, f2, d4, f4, b6, a7, c7 (7)

Чорныя простыя: h2, c3, h4, a5, f6, g7, f8 (7)

№ 18

Белыя простыя: белые b2, h2, b6, d6, f6, h6, c7, e7 (8)

Чорныя простыя: d2, f2, c3, e3, d4, f4, h4, a5, d8 (9)

Наш чытач Ігар Ананіч паведамляе, што ў Гродзенскім дзяржаўным аграрным універсітэце прайшла спартакіяда сярод выкладчыкаў і супрацоўнікаў «Бадзёрасць і здароўе». Сярод мноства розных спаборніцтваў быў і шашачны турнір. Паглядзіце некалькі цікавых пазіцый з гэтых спаборніцтваў.

№ 19 І. Ананіч — С. Бандарэнка

Белыя простыя: a1, a3, a5, b4, e1, f2, g1, h2, h4(9)

Чорныя простыя: b6, b8, c7, e5, e7, f6, g5, g7, h8(9)

Белыя выкарыстоўвалі рашотнасць размяшчэння чорных. Пакажыце камбінацыю.

№ 20 І. Ананіч — М. Клімаў

Белыя простыя: a1, b2, c1, c5, e1, e3, f2, f4, g1, h2(10)

Чорныя простыя: a5, a7, b8, c7, f6, g5, g7, h4, h6, h8(10)

У белых пазіцыйная перавага і маецца некалькі камбінацый, аднак толькі адна з іх вядзе да перамогі. Адшукайце самастойна.

У шашкі-100 кампазіцыі складзеныя вядучым адзела.

№ 21

Белыя простыя: 48, 49, 44, 38, 33, 34, 27, 25 (8)

Чорныя простыя: 45, 35, 21, 23, 16, 20, 14, 9, 4 (9)

№ 22

Белыя простыя: 49, 41, 44, 34, 25 (5)

Чорныя простыя: 38, 27, 28, 30, 16 (5)

№ 23

Белыя простыя: 46, 45, 18, 20, 14, 8, 9, 10 (8)

Чорныя простыя: 44, 37, 39, 31, 35, 27, 25, 17, 11 (9)

№ 24

Белыя простыя: 50, 38, 39, 31, 22, 23, 18, 12 (8)

Чорныя простыя: 41, 44, 45, 36, 27, 24, 25, 2 (8)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

З лістоў чытачоў: «Дзякуем аўтарам і вядучаму за цікавы і змястоўны матэрыял», — пішуць Ф. Карпей і Л. Жыхар.

Праверце свае рашэнні: выпуск № 183 ад 20.01.2023.

№ 9 1. d2-e3 c5-b4 2. a5-b6 b4:f4 3. f2-g3 h4:f2 4. g1:e7 f8:d6 5. h6:c5 h2-g1 6. b6-a7 g1:b6 7. a7:c5 2-0t (Супадае з раней апублікаванай пазіцыяй М. Левандоўскага на інтэрнэт-форуме planet-ka 30.07.18, паведаміў уладальнік картатэкі шашачных кампазіцый А. Панчанка з Дняпра.)

№ 11 [1...dc3 2.gf6 cd2 3.gf2 e:e7 4.d:c1 x]

2. g:a7 gf6 3. g:e7 ab4 4. e:a3 ec3 5. ab4 c:a5 6. ab6 a:c7 7. d:b6 x

№ 12 1. ca3 gh2

[1...gh4 2. hf6 h:b4 3. a:b8 ab4 4. be5 x]

[1...ge1 2. cd6 c:e5 3. h:c3 e:b4 4. a:c5 x]

2. he5 h:b4 3. a:b8 ab4 4. be5 x

№ 13 1. h6-g7 a5:c3 2. a1-b2 c3:a1 3. g5-h6 e3:g5 4. c1:e7 d8:h8 5. h4:f6 a1:g7 6. h6:f8 h8-g7 7. f8:h6+

№ 14 1. c3-d4 a5:g7 2. e7-f8 d6:b4 3. f8:h2 e1:g3 4. h2:a3+

№ 15 1. 27-22 16:09 2. 31-27 32:12 3. 43:03+

— На ногі цёплыя шкарпэткі і ў пасцель! Чуеце?! — скінуўшы вопратку і страціўшы рэшткі цярпення крычала «дакторка». — Не-е, на работу прыходзіць нельга! Мы справімся!

«Няўжо развітаюцца?» — падумала я, спаўзаючы з крэсла. І шанц на гэта быў, аднак Віталеўна зноў «наступіла на граблі»: сказала сваё «лячыцеся!» і шэф папытаўся, як?

— У пасцель! — загадала «дакторка». — І зараз жа! Сон — найлепшыя лекі!

На гэтым яна скончыла размову, апранулася, і мы разам выскачылі з пакоя.

...Як данесла пазней сарафаннае радыё, дырэктара той установы неўзабаве звольнілі, бо ён, казалі, знайшоў такі на рабоце каньяк і палячыўся так, як хацеў, а не так, як яго вучыла бухгалтарка.

Наталля Сямёнава,

г. Гомель.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Неасабісты суб'ектыў

Папяровае шчасце

Аб карысці чытання звычайных кніг

КАЛЕГА нядаўна нечакана прапанаваў: «Глянь, што знайшоў у кабінеце ў шафе. Сараяна. Хочаш пачытаць?» І працягвае мне тоўстую, бы Біблія, кніжку ў цяжкой цвёрдай вокладцы. «Давайце». Узяла той «гросбух» хутчэй таму, што няёмка было адмаўляцца, і паклала на прыстаўны столік у кабінеце. У кнігі ў рудой вокладцы былі ўсе шанцы паляжаць там тыдні два неразгорнутай і вярнуцца ў кабінет да гаспадара. Перадумоў менавіта на гэта развіццё падзей было нямала. Па-першае, на працы чытаць не будзеш, бо, калі і выпадае вольная хвілінка, — ёсць жа яго вялікасць Інтэрнэт у неабмежаванай колькасці на камп'ютары прама пад носам. Па-другое, несці цяжкую кніжку дадому, а тым больш цягаць яе з сабой, чытаючы ў транспарце, таксама не выпадае. Дома — усё той жа неабмежаваны Інтэрнэт, у дадатак тэлевізар, а ў тралейбусе ці метро — заўжды пад рукой смартфон, у якім і навіны, і кніжкі, і ўсё іншае, нават халера і трасца...

АЛЕ, вы не паверыце, ужо каторы дзень у абед я «завісаю» над тым Саранянам. Кніжка сапраўды тоўстая, амаль на восемсот старонак (там некалькі твораў), выдадзеная яшчэ за Саюзам, у канцы 1980-х. Дробны шрыфт, не вельмі белыя ўжо ад часу старонкі. Але, разгарнуўшы яе аднойчы, прачытаўшы назву рамана «Чалавечая камедыя» і першыя радкі пра хлопчыка Уліса з невялікага амерыканскага гарадка Ітака, які назіраў за норкай сусліка, а потым пабег глядзець на цягнік, я ўжо не магу пакінуць гісторыю няскончанай, і кожны дзень рука сама цягнецца да кнігі. Хаця не магу сказаць, што я вялікая прыхільніца амерыканскай літаратуры, ды і сюжэт, хай даруе мне Уільям Сараян, просты і нават дзесьці прадказальны. Але ж гэта незвычайная магія вобразаў і ўяўлення ўсё роўна зацягвае, і на нейкі час ты адключаешся ад надзённых спраў і турбот.

І, ведаеце, за гэтыя дні нават настрой палепшыўся. Хаця і надвор'е, мякка кажучы, так сабе, і нейкіх рабочых ды побытавых праблем і клопатаў навалілася. Няўжо прычына ў той кніжцы ў рудой вокладцы? Разважала сёння над гэтым і прыйшла да высновы: так, менавіта ў ёй. Я нават не магу патлумачыць, што гэта за адчуванне, але яно нібы вярнулася з дзяцінства, з падлеткавага ўзросту, калі чытаў запоем, з ліхтарыкам пад коўдрай або зімой на печы, завалокшы на шафу і падключыўшы праз некалькі правадоў настольную лямпу (яна тады станавілася літаральна падстольнай, бо гарэла пад самай століцу). З вясковай хаты ты раптоўна трапляў у дзівосныя невядомыя краіны — з дапамогай не толькі Жуля Верна, але і нашых Янкі Маўра ды Паўла Міско, змагаўся на дуэлях з мушкецёрамі, разблытваў злачынствы з міс Марпл і Эркюлем Пуаро. У звычайнай вясковай хаце была бітком набітая кнігамі шафа, якая хавала ў сабе цэлы дзівосны сусвет і шчодра дзялілася ім з усімі ахвотнымі...

КАЛІ і як я забылася пра гэту здольнасць перамяшчацца ў іншую рэальнасць? Зараз магу сказаць дакладна: калі памяняла папяровую кнігу на смартфон. Дзякуючы спампаванай на яго праграме я прачытала за апошнія гады процьму цікавых кніг. Але... у памяці засталіся толькі сюжэты, як той казаў, у сціслым пераказе. Няма гэтага адчування далучанасці, паглыблення, калі памятаеш, на якім месцы старонкі які цікавы эпізод напісаны, калі можна пагартаць кніжку і перачытаць упадабаныя ўрыўкі або нават часам зазірнуць на апошнюю старонку, бо так жа карціць даведацца, чым усё скончыцца. Вадзіць пальцам па экране — гэта зусім не тое. Няма адчування патоку, як яго называюць сацыёлагі, — гэта калі паглыбляешся ў сюжэт цалкам, адключаючыся ад навакольля, і цябе падхоплівае гэты паток і нясе, пагойдваючы, удалеч. (Дарэчы, менавіта гэта стан, як сцвярджаюць тыя ж сацыёлагі, у сучасным мітуслівым грамадстве многія асацыююць з паняццем «шчасце».) Што яшчэ цікава — ні адну з прачытаных на смартфоне кніг, нягледзячы на тое, што ўсе яны даступныя, захаваныя ў памяці гаджэта, мне не захацелася перачытаць. Хаця дакладна ведаю, што, калі б «Свечка» Валерыя Залатухі ці «Руская канарэйка» Дзіны Рубінай стаялі ў мяне на кніжнай паліцы, яны б неадноўчы былі адтуль узятыя. А так нібыта і ёсць кніга — і няма яе...

НЕ ведаю, можа, я проста занадта старамодная, але мяне вельмі бянтэжыць, калі бываю ў навасёлаў і бачу, што месца для кніжнай шафы ці нават паліцы ў іх пасучаснаму абстаўленай кватэры не прадугледжана ўвогуле. Дзіцячыя кніжкі яшчэ можна сустрэць сярод цацак, але кніг менавіта ў самым класічным — папяровым выкананні для падлеткаў, а тым больш для дарослых і не ўбачыш. Усё ў віртуальнай прасторы. А як жа быць з вобразамі, з уяўленнем, з пахам дрункарскай фарбы ці пажаўцелай пыльнай паперы? З дзівосным светам, з жаданнем перагарнуць старонку і перачытаць тое, што давяло да слёз ці рассмяшыла? З тым, чаго ні ў многіх маладых дарослых, ні ў іхніх дзяцей, якія падрастаюць, ужо проста няма. Можа, у тым ліку і па гэтай прычыне яны, маладыя, такія рэзкія, катэгарычныя, да многага халодна-раўнадушныя, нібы не жыццё пражываюць, а гуляюць у камп'ютарную гульню?..

А Сараяна я на выхадныя ўсё ж не палянуюся, вазьму дадому. Хочацца хутчэй даведацца, чым скончылася гісторыя Гамера і Уліса з невялікага амерыканскага гарадка Ітака...

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703.
Продавец	ОАО «Криница», г. Минск, ул. Радиальная, 52
Оператор ЭТП/ адрес ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. **www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов: транспортные средства с пробегом. Месторасположение: г. Минск, ул. Радиальная, 52

№ лота	Наименование	Инв. №	Начальная цена с НДС 20 %, руб.
1	Легковой седан **Volvo S80**, рег. знак 9240ME-7, 2003 г. в.	16778	6 120,00
2	Легковой **седан Volvo S60**, рег. знак 9794 КЕ-7, 2001 г. в.	15301	6 768,00
3	Грузовой фургон изотермический **ГАЗ 3302**, рег. знак АЕ 7528-7, 2008 г. в.	14566	3 312,00
4	Грузовой вагон **GAZ-2752**, рег. знак АА 3792-7, 2006 г. в.	15177	2 544,00
5	Грузовой фургон изотермический **ГАЗ 3302**, рег. знак АЕ 7527-7, 2008 г. в.	14555	3 960,00
6	Полуприцеп фургон изотермический **«КУПАВА 930011»**, рег. знак А 3519 А-7, 2008 г. в.	14799	4 104,00
7	Полуприцеп специальный фургон-рефрижератор **Schmitz SK024**, рег. знак А 0930 А-7, 2000 г. в.	19658	4 032,00
8	Грузовой седельный тягач **MAZ 5440A8-360-030**, рег. знак АН 4733-7, 2013 г. в.	17927	8 544,00

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов **www.cpo.by.**
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней после проведения электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнуто договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **10 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона. Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 13.01.2023

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 14.02.2023 с 11.00 до 13.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 13.02.2023 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06
E-mail: auction@cpo.by

ОАО «Минскоблхлебопродукт»

извещает, что внеочередное общее собрание акционеров состоится 14 февраля 2023 года по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, 2. Начало собрания в 10.00.

Регистрация акционеров с 9 часов 30 минут до 9 часов 55 минут. При себе иметь документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. О реорганизации открытого акционерного общества «Минскоблхлебопродукт» в форме выделения унитарного предприятия «Лошницкий край» открытого акционерного общества «Минскоблхлебопродукт».
2. О порядке выкупа акций открытым акционерным обществом «Минскоблхлебопродукт» по требованию акционеров, цене выкупа акций и сроке реализации такого права.
3. О внесении изменений в устав открытого акционерного общества «Минскоблхлебопродукт».
4. О согласовании норм утраты товара при его хранении, транспортировке и (или) реализации в пределах норм естественной убыли (потерь, боя) в унитарном предприятии «Борисовский комбинат хлебопродуктов» открытого акционерного общества «Минскоблхлебопродукт».

Наблюдательный совет ОАО «Минскоблхлебопродукт». Тел. 282-57-57.

УНП 600013173

09.02.2023 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельжилпроект».

Повестка дня

1. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Гомельжилпроект»: г. Гомель, ул. Кирова, 17.
Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Кирова, 17.
Время регистрации в день проведения собрания с 13.30 до 14.00.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 02.02.2023 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.
Дата сбора реестра акционеров – 02.02.2023 г.

Наблюдательный совет.

УНП 400022625

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Слуцк-Модуль» (продавец) в процедуре ликвидации юридического лица проводит открытый аукцион по продаже одним лотом

СКЛАДА ГАЗОВЫХ БАЛЛОНОВ

с инв. № 640/С-84442 общей площадью 107,8 кв. м и гradирни металлической ККТ-35 (инв. № 25301) с инв. № 640/С-84372, расположенных на земельном участке с кадастровым номером 624650100001010077 *(право аренды по 05.04.2052)* площадью 0,1912 га по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, 101/10.

Земельный участок имеет ограничения в использовании: территория, подлежащая специальной охране (в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения), пл. 0,1912 га.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 11 700,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **1 170,00** бел. руб.
Начальная цена снижена на 10 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330 000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.

Шаг аукциона – 5 процентов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов, (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель).

Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 25.11.2022.

Аукцион состоится **16.02.2023** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.02.2023** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.
Тел. для осмотра 8 (044) 72 35 122.

УНН 600074992

ОАО «Управление специальных строительных работ

Стройтрест № 7»

ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ (их представителей) О ПРОВЕДЕНИИ 29 марта 2023 г. ГОДОВОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, д. 16, каб. 316.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ

1. Об итогах работы Общества в 2022 году и основных направлениях развития на 2023 год.
2. Отчет совета директоров и ревизионной комиссии о работе в 2022 году.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса Общества и направлений использования чистой прибыли за 2022 год. О дивидендах за 2022 год.
4. О направлениях использования прибыли Общества в 2023 году.
5. Внесение изменений в устав Общества.
6. Внесение изменений в Положение о совете директоров.
7. Выборы членов совета директоров и ревизионной комиссии.
8. Утверждение списка аффилированных лиц.
9. О выплате дополнительного вознаграждения членам совета директоров по результатам работы за четвертый квартал 2022 года.

Место проведения собрания:
г. Минск, пр-т Машерова, д. 16, каб. 316.
Начало работы собрания **в 11.00.**

Регистрация участников собрания с 10.00 до 10.50 в день проведения собрания по месту его проведения. Акционеру при себе иметь документ, удостоверяющий личность, представителю акционера – документ, удостоверяющий личность, доверенность или договор.

Список акционеров для регистрации участников собрания будет составлен по данным реестра акционеров на 1 марта 2023 г.

Орган, созывающий собрание: совет директоров Общества, основание созыва: протокол от 30.01.2023 № 30-01/2023.

С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница) с 14.00 до 17.00, начиная с 27.02.2023, по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, д. 16, каб. 316.

Совет директоров ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7».

УНП 100088916

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛГАЗСТРОЙ»-управляющая компания холдинга» (Продавец)

Аукцион состоится 02.03.2023 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1, состав:

1. Здание производственного корпуса с АБК, инв. № 500/С-30079, 2242,5 кв. м;
2. Склад неотапливаемый, инв. № 500/С-30078, 2404 кв. м;
3. Склад хранения материалов, инв. № 500/С-62721, 557,4 кв. м;
4. Склад хранения битума, инв. № 500/С-62722, 539 кв. м;
5. Здание диспетчерской, инв. № 500/С-62723, 36,8 кв. м;
6. Склад карбида, инв. № 500/С-62724, 26,7 кв. м;
7. Ливневая канализационная сеть, инв. № 500/С-1031132, 836,6 м;
8. Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть, инв. № 500/С-13011466, 587,7 м;
9. Хозяйственно-бытовая канализационная сеть, инв. № 500/С-13011467, 651,3 м.
10. Прочее имущество:
- котел стальной твердотопливный на пеллетах КОП-58, инв. № 8633;
- шлагбаум автоматический, инв. № 8504;
- система видеонаблюдения, инв. № 4114;
- трансформатор ТНО б/у, инв. № 4026072;
- кран-балка г/п 3т, инв. № 4132075;
- кран-балка АШ-162 г/п 1т, инв. № 4132076;
- внутриплощадочные электросети б/у, инв. № 318058;
- внутренние слаботочные сети б/у, инв. № 320069.

Адрес: г. Минск, ул. Селицкого, 11, 11/1, 11/2, 11/3, 11/4, 11/5, 11 (КлК-1 - КлК-сущ.), 11 (ВпК-1 - ВпК-13), 11 (КбК-1 - КбК- сущ.).

Обременения: действующие договоры аренды.

Земельный участок площадью 2,3042 га с кадастровым номером 500000000002000355.

Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Начальная цена с НДС 20 % – 3 914 627,20 руб.

Задаток – 391 462,72 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900 100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – 28.02.2023 в 11.00.

Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНЫХ ЖИЛЫХ ДОМОВ

ОРГАНИЗАТОР: ЛУКОМЛЬСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ЧАШНИКСКОГО РАЙОНА ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ

№ лота	Местоположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер	Целевое назначение	Площадь (га)	Кадастровый номер	Расходы по подготовке и изготовлению документации, руб.	Начальная цена, руб.	Сумма задатка 10 %, руб.
1	**Витебская обл., Чашникский р-н, д. Абузерье, ул. Дачная, 5У**	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	0,2474	225183000101000257	1955,81	6 000,00	600 ,00

Условие проведения аукциона:
наличие не менее двух участников;
заключение с Лукомльским сельским исполнительным комитетом соглашения.

Победителю аукциона, либо в случае признания аукциона несостоявшимся, единственному участнику несостоявшегося аукциона, выразившего согласие на предоставление ему земельного участка в частную собственность:
- возместить затраты, связанные с проведением аукциона;
- внести плату за земельный участок.

Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории:
подключение к сетям и сооружениям инженерной инфраструктуры выполняется по техническим условиям эксплуатирующих организаций с учетом нагрузок, определенных при разработке ПСД.

Аукцион состоится **22 февраля 2023 г. в 11.00** по адресу: аг. Лукомль, ул. Максима Горького, 9, Лукомльский сельисполком.

Заявления и пакет необходимых документов представляются участниками с 8.00 до 17.00 со дня опубликования настоящего извещения и до **14 февраля 2023 г.** включительно по адресу: аг. Лукомль, ул. Максима Горького, 9, Лукомльский сельисполком.

1. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, подавшие в установленном порядке заявление на участие в аукционе, а также документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка, кроме того, в комиссию представляются:
гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования, а представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;
Сумма задатка перечисляется на расчетный счет № BY68AKBB36413 29052200200000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300986851, код платежа 4901, получатель – Лукомльский сельский исполнительный комитет.
Оплата стоимости предмета аукциона, подлежащая возмещению Победителем, осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона.
Контактные телефоны: 8-(02133) 6 41 45, 6 05 30.

«НЕ ЗАБЫВАЙ, ШТО Ў ЛЮБУЮ ХВІЛІНУ МОЖА ВЫСКАЧЫЦЬ З КАНАПЕЛЬ РАБАЯ СВІННЯ»

Што раілі беларускія класікі маладым пісьменнікам

Напэўна, кожны пачатковец марыць пачуць такую параду ад мэтра, каб ужыць — і адразу стварыць шэдэўр. Мэтры звычайна таксама не супраць штосьці разумнае прамовіць захопленым слухачам... Праўда, парады, як сцвердзіцца ў літаратуры, даюць не толькі класікі. Па праўдзе, дык сёння і той самы пачатковец можа ў сваім блогу іншых павучаць. Усемагчымых курсаў, як напісаць раман ці паэму, — як галубоў каля толькі што накрышанай булкі.

Зрэшты, нічога новага няма, не-як напаткала ў Сетцы «Пратакол даклада кіраўніка Магілёўскай філіі аб'яднаньня паэтаў і пісьменьнікаў «Маладняк» Уладзіміра Паскрэбкі 22 лютага 1925 г.», дзе сярод іншых даюцца маладым аўтарам парады: *«Націск павінен быць у тым радку, дзе рыфма, і асабліва моцным. Музыкальнасьць завісіць ад захопленасьці рыфмы. Радкі нада пісаць кароткія, бо доўгія цяжало чытаць. Дзеля таго каб пісаць, ня нада прытрымлівацца таго, каб першая строчка находзіла на другую, ці трэццюю — гэта старая тэорыя, ня трэба сядзець над радкамі і вымяраць іх... Вобраз трэба рабіць, каб ён падыходзіў да народа, тады верш будзе красівы і мілагучны».*

Зразумела, кожнаму важна пачуць добры водгук на свой твор... Іван Неслухоўскі, якога мы ведаем пад псеўданімам Янка Лучына, перш чым прапаноўваць напісанае ў якія газеты ці часопісы, дасылаў свайму сябру Аляксандру Валіцкаму:

«А як згледзіш пане,
што нуду напуста
Наганяць не варта, можа,
гэтым глупствам,
То прашу пакорліва
я ў тым выпадку
Вынесі прысуд свой,
знішч яго нагладка.»

От каб усе пачаткоўцы былі такімі крытычнымі да сябе...

Якуб КОЛАС: шліфаваць мову і ўзірацца ў жыццё

Якуба Коласа многія называлі сваім настаўнікам у літаратуры. Галоўны яго запавет маладым: «Слова для пісьменніка — гэта асноўная канва, па якой ён будуе сваю мастацкую творчасць». Пісьменніца Алена Васілевіч успамінала, як дала Коласу, з якім сябравала, пачытаць свой твор «Шляхі-дарогі». Чакала-чакала водгуку, урэшце не вытрымала, папыталася, ці спадабалася:

«Ён адказаў не адразу, адказаў, гледзячы недзе ўбок:

— Мова вельмі нязграбная. Трэба вучыцца мове.

І гэта мяне страшэнна здзівіла. Нязграбная мова? У мяне і думкі пра гэта не было! Усе мае, як кастрыца жарсцвяныя, «маючыеся» і «працуючыя», «нагадваўшыя» і «змагаўшыеся» нават не краналіся тады маіх вушэй. Яны ўсё роўна як ватай былі заткнутыя.

— Без мовы... калі няма адчування слова, то не трэба і пісаць, — так падагуліў нашу гутарку «на літаратурную тэму» Канстанцін Міхайлавіч.»

Маладая пісьменніца не пакрыўдзілася — больш за тое, лічыла, што той рэзкі водгук пайшоў на карысць, дапамог ёй прыслухацца да мовы і ўдасканаліць яе. У лісце да Міхася Лынькова пра яго раман «Векапомныя дні» Колас таксама сцвярджае: *«Не таўшчына кнігі, не лік старонак яе павінны займаць аўтара. Трэба шліфаваць мову, кожнае слова і сказ, каб яны гарэлі моцна, хораша, пераканаўча, ясна і проста, — «вельмі нават проста-с!»*

У паўсядзённым жыцці літаратурныя размовы Колас не вельмі любіў. Іван Шамякін згадваў, як прыйшоў да яго ўпершыню дахаты з групай маладых пісьменнікаў, дзе былі Іван Мележ, Янка Брыль, Анатоль Вялюгін, Кастусь Кірэенка... Усе чакалі, каб класік пачаў іх вучыць, як пісаць. А Колас давай паказваць сваю палоску жыта, сад, потым байкі баіць пра розных знаёмых людзей... Так дзень і прабавілі. Шамякін зрабіў выснову: недарэмна. Гэта і быў урок ад Коласа: найперш — жыццё, якое ёсць аснова літаратуры.

Янка БРЫЛЬ: не апраўдвацца адсутнасцю ўмоў, дапрацоўваць творы

У сваім цыкле «Пра запавет-нае» Янка Брыль звяртаецца да маладых творцаў, прыводзячы ім у прыклад патрабавальнага да сябе Льва Талстога, які бясконца правіў і крэсліў свае рукапісы:

«А ўсё ж бывае і сёння, калі заходзіць гутарка пра гэтую добрасумленнасць мастака, сёй-той з літаратараў ахвотна ківае на іншую акалічнасць — Талстой меў, бачыце, Ясную Паляну, чаму было не працаваць! Па простай логіцы — дайце маёнтачак нам, дык і мы, чаго добрага... Словам, таварыш не будзе тады спяшацца, не памчыць у рэдакцыю сяк-так дацягнуты напярэдадні першы варыянт, не будзе больш прыкрывацца ад крытыкі дзіравай плашч-палаткай аператыўнасці або нават і «грамадзянскага абавязку», не будзе спадзявацца на рэдактараў ды стылістаў, якім нярэдка яшчэ ў нас даводзіцца і абціраць, і мыць, і прачэсваць чужых неданоскаў — звыш меры, абавязку і зарплаты...

Літаратурнаму юнцу, які ад горычы часовых нястач ці проста па наіўнасці дапамагае халтуршчыкам ныць ды хіхікаць у адрас вялікіх настаўнікаў, варта памятаць пры гэтым, што далёка не ўсё ў творчасці вырашае матэрыяльная забяспечанасць. Ёсць і ў наш час уладальнікі раскошных кватэр і дач, аўтамашын, стэнаграфістак і магнітафонаў — некаторыя з так званых вядучых пісьменнікаў, што і за белы хлеб адплачваюць сырой, павярхоўнай літаратурнай прадукцыяй, у якой адсутнасць значнай думкі і сапраўднага пачуцця, адсутнасць або скажэнне жыццёвай праўды ніяк не кампенсуецца ні пропаведдзю агульнавядомых ісцін, ні ілюстрацыямі на хадовыя тэмы, ні наяўнасцю адносна прыстойнай формы...»

Андрэй МАКАЁНАК: не быць прымітыўным і не ўзносіцца

Востра адгукаўся на бяздарнасць і Андрэй Макаёнак. У 1980 годзе ён запісвае:

«Банальнасць лезе тады, калі аўтар аблягчае сваю задачу, не лезе ў глыбіню чалавечай псіхалогіі, не раскрывае прычыннасць канфліктаў. Сачыняць банальныя, прымітыўныя гісторыі — усё роўна што плесці лапці. Але ж лапці даўно выйшлі з моды. Выйшлі, бо недаўгавечныя яны і не на ўсякае надвор'е. Трэба шыць боты. Ужо ж праславіцца шаўцом лепей, чым лапцюжнікам».

А ў гутарцы газеце «Літаратура і мастацтва» Андрэй Макаёнак падзяліўся важным урокам, засвоеным ім з маленства: «Не возносись!»

«У кожнага чалавека ёсць нейкая дэталь ці эпізод, з якога ён пачынае сябе помніць. Дык вось, здарылася гэта, калі мне мінуў чацвёрты ці пяты год. Мой дзядзька пасадзіў мяне на каня. Эмацыянальная памяць захавала гэтае самаадчуванне: верхам на кані! Самастойна! Праўда — аберуч за грыву. На кані я стаў вышэй за дзядзьку, вышэй плота, вышэй саламянай страхі, нават вышэй канапель паабапал сцежкі ў гумно. Дзядзька вядзе каня на повадзе, а я... «вознесся». Адным словам. І раптам (адкуль як чорт паслаў) з канапель на сцежку выскачыла рабая свіння. Конь з перапуду ўзвіўся на дыбы. І я з гэткай вышыні чмякнуўся вобзем. А калі ачомаўся, каля мяне галасіла маці, нехта паліваў мяне з шапкі вадой з лужыны... Ні каня, ні вышыні. Каноплі, як лес, высокія...

З таго часу і па сёння запомніў: як бы ёмка ні адчуваў сябе на кані, як бы ўчэпіста не трымаўся за грыву — не забывай, што ў любую хвіліну можа выскачыць з канапель рабая свіння і перабегчы дарогу, а палахлівы конь можа ўзвіцца на дыбы, і зноў можна чмякнуцца вобзем, бо, ухапіўшыся за грыву, не трэба думаць, што трымаеш бога за бараду. З каня я злез. За рабочым сталом самая ўстойлівая пазіцыя».

Уладзімір КАРАТКЕВІЧ: ратавацца самаіроніяй і не слухаць усе парады

Малады настаўнік Уладзімір Караткевіч, атрымаўшы адмоўны адказ на свае вершы, пасланыя ў «Вожык», напісаў аж некалькі лістоў галоўнаму рэдактару Кандрату Крапіве. Асабліва абурыла Караткевіча фраза «напісана мовай XIX стагоддзя».

«Альбо гэта вельмі дрэнны жарт, альбо — няведанне сваёй мовы і нелюбоў да яе. І адно і другое не на гонар літ. кансультанту», «гэтым ён паказвае, што не паважае людзей, якія жылі ў той час і на гэтай мове працавалі, а па-другое, смяецца над тымі недахопамі, над якімі смяяцца не варта», «фанабэрыстая пагарда да вялікай эпохі і вялікіх людзей»...

Караткевіч мог агрызнуцца яшчэ як на крытыку ад любога аўтарытэта... Пры гэтым і да сябе быў бязлітасны. У лісце да сябра Леаніда Крыгмана ён агучвае рэцэпт, як маладому аўтару не ўпасці ў адчай:

«Трудно жить — читай Беранже, как бы это ни казалось вначале противоестественным, постарайся самого себя осмеять десятком ядовитых виршей, и все пройдет. Когда меня, например, не приняли в аспирантуру, сделав предпочтение для одной министерской дочки, я сочинил цикл «Стоны сердца», в котором основная мысль была: «Буду чернилом мочиться, навоз из-под ректора есть, а все-таки попытаюсь в аспирантуру пролезть».

Але калі Юрый Гальперын даслаў Уладзіміру Караткевічу на водгук свае вершы, той не мінальнічаў, хоць звыкла прыкрываўся самаіроніяй: *«Чтобы до конца сыграть роль критика, одеваю очки — и, сердито бурча, начинаю копаться в том, в чем терпеть не могу копаться: в ямбах, хореях, пиррихиях и прочей ерунде. Я приучился отличать ямб от хорея, когда пришлось объяснять разницу между ними детям. Столько раз объяснял, что наконец-то и сам понял... У тебя немножко хромают некоторые куплеты. Может, ты сам это сделал нарочно? Я это иногда для выразительности делаю».*

Караткевіч разбірае памылкі ў вершы, але падкрэслівае, што галоўнае права — у паэта, і прыводзіць прыклад, як адноўчы занёс нейкаму абрыдламу ментару ў кабінет маладога аўтара ў Кіеве ў якасці ўласнага твора верш Буніна пра дзяўчынку Хрысцю, якая няньчыць лялек ля гумна. Кансультант заявіў, што ў вершы мала лірызму, і «лучше бы эта Христя не кукол нянчила, а колоски собирала за маминым комбайном и убедилась наконец, что мама их убирает чисто и убирать нечего, а, стало быть, она даром потратила день».

У лісце да Еўдакіі Лось ад 17 мая 1958 года Караткевіч паўтарае сваю параду: *«Ёсць мудры прынцып: слухай крытыку, бяры з яе тое, што лічыш слушным, а на астатняе плюй. Ты ведаеш сябе і патрэбы свае лепей за крытыкаў».*

Што ж, спадзяюся, нейкія з гэтых парад дапамогуць камусь на шляху ў вялікую літаратуру...

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Каляндар стрыжак на люты

3 лютага, пятніца. Стрыжка і афарбоўка валасоў непажаданыя, могуць негатыўна паўплываць на вашу самаацэнку, прывабнасць і настрой.

4 лютага, субота. Уплыў Месяца на валасы вельмі пазітыўны: яны становяцца мацнейшымі, густэйшымі, выглядаюць здаровымі і не сякуцца.

5 лютага, нядзеля. Работа цырульніка над вобразам дазволіць выглядаць вам цудоўна. Спрыяльны дзень для агульнаўмацавальных працэдур і афарбоўвання валасоў.

6 лютага, панядзелак. Выдатны дзень для стыльнай стрыжкі, афарбоўвання валасоў як у натуральны колер, так і яркія кантрасныя адценні.

7 лютага, аўторак. Пасля сённяшняй стрыжкі валасы будуць здаровымі, моцнымі. Не стрыжыцеся занадта коратка і не мяняйце колер валасоў.

8 лютага, серада. Стрыжка палепшыць стан здароўя, надасць энергіі і сіл. Паколькі Месяц памяншаецца, стрыжка надоўга захавае сваю форму.

9 лютага, чацвер. Няўдалы дзень для стрыжкі і іншых маніпуляцый з валасамі.

10 лютага, пятніца. Цудоўны дзень для паходу да майстра і работы са знешнім выглядам.

11 лютага, субота. Нейтральны дзень для наведвання цырульніка.

12 лютага, нядзеля. Прычоска можа быць удалай, але валасы стануць больш непаслухмянымі, іх будзе вельмі складана ўлажыць, нават спецыяльныя сродкі не дадуць чаканага выніку, форма прычоскі можа ўвесь час парушацца.

13 лютага, панядзелак. Лепш адкласці візіт да цырульніка, пасля стрыжкі валасы могуць стаць непаслухмянымі, дрэнна ўкладвацца і доўга адрастаць.

14 лютага, аўторак. Сёння любыя мадэльныя стрыжкі атрымаюцца проста цудоўна, таму смела ідзіце да майстра.

15 лютага, серада. Занадта коратка валасы стрыгчы не варта, а вось укараціць на 3-5 сантыметраў — у самы раз. Стрыжка надасць сіл для дасягнення пастаўленых мэт. Афарбоўванне валасоў у любыя тоны будзе спрыяць павелічэнню фінансавага патоку.

16 лютага, чацвер. Стрыжка атрымаецца акуратнай, са старанна прапрацаванымі дэталямі і выразнымі лініямі.

17 лютага, пятніца. У гэты перыяд можна падраўнаваць адрослыя кончыкі, афарбаваць валасы ў натуральныя адценні. Не раім кардынальна мяняць імідж, гэта можа прыцягнуць непатрэбныя праблемы.

18 лютага, субота. Стрыжку адкладзіце, каб не наклікаць бяду. Афарбоўванне таксама лепш перанесці на іншы дзень. Калі вельмі хочаце пафарбаваць валасы, то выбірайце цёмныя адценні.

19 лютага, нядзеля. Новая прычоска дадасць станоўчай энергіі, дапаможа знайсці правільнае рашэнне, унясе ў жыццё свежыя ўражанні і прыемны настрой.

20 лютага, панядзелак. Не рэкамендуецца састрыгаць валасы, з абстрыжанымі пасмамі сыдзе і ўпэўненасць у сабе.

21 лютага, аўторак. Не варта кардынальна стрыгчы, мяняць колер валасоў. Можна злёгку абстрыгчы кончыкі, асвяжыць тон, надаўшы яму насычанасці, падправіць існуючую прычоску.

22 лютага, серада. Сёння вельмі супярэчлівы дзень для любых маніпуляцый з валасамі, стрыжыцеся, толькі калі вы гатовыя да сюрпрызаў. Новая прычоска можа як парадаваць, так і засмуціць вас.

23 лютага, чацвер. Неспрыяльны дзень для стрыжкі, пачакайце да заўтра, каб не страціць штосьці важнае.

24 лютага, пятніца. Цудоўны перыяд для стрыжкі і афарбоўвання. Любая змена ў знешнім выглядзе дапаможа змяніць лад жыцця ў лепшы бок, дадасць станоўчых вібрацый.

25 лютага, субота. У гэты дзень стрыжка парадуе, валасы стануць мацнейшымі і прыгожымі. З дапамогай новай прычоскі можна значна амаладзіць свой выгляд.

26 лютага, нядзеля. Час спрыяльны для паветраных, аб'ёмных прычосак, пасля стрыжкі прыкметна паскараецца рост валасоў.

27 лютага, панядзелак. Добры дзень для рамантычнай паветранай стрыжкі. Пасля новай прычоскі вас акружаць прыхільнікі, а навакольныя будуць абсыпаць камплімэнтамі.

28 лютага, аўторак. Сёння не рэкамендуюцца якія-небудзь сур'ёзныя змены ў прычосцы і стрыжцы, бо гэта можа прыцягнуць негатыўную энергію. Дзень не прызначаны для стрыжкі, прычоска вам не спадабаецца.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.53	17.54	9.01
Віцебск —	8.47	17.39	8.52
Магілёў —	8.43	17.44	9.01
Гомель —	8.35	17.46	9.11
Гродна —	9.08	18.10	9.02
Брэст —	9.03	18.16	9.13

Месяц

Першая квадра
28 студзеня.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Агніі, Валяр'яна, Ілыі, Максіма, Яўгена.*
К. *Яны, Іпаліта.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

3 ЛЮТАГА

У краіне

1583 год — у вёсцы Моладава (цяпер у Іванаўскім раёне) адліты медны моладаўскі звон — помнік мастацкага ліцця, эпіграфікі і палеаграфіі Беларусі. Захоўваецца ў Музеі старажытнабеларускай культуры НАН Беларусі.

1740 год — заснаваны Нясвіжскі тэатр Радзівілаў. Існаваў у Нясвіжы па 1791 год. З 1746-га пры княгіні Францішцы Радзівіл дзейнічаў як аматарскі: у спектаклях нараўне з прыгоннымі ўдзельнічалі члены княжацкай сям'і, шляхта, кадэты нясвіжскага корпуса (першы спектакль — «Прыклад справядлівасці»). Паказы ў суправаджэнні Нясвіжскай капэлы Радзівілаў праходзілі ў спецыяльным будынку «Камедыенхаўз», у прадмесці Нясвіжа Альбе пад адкрытым небам і ў палацы «Кансаляцыя».

1848 год — нарадзіўся (г. Гродна) Эдуард Антонавіч Урублеўскі, расійскі хімік-арганік; адзін з заснавальнікаў Рускага фізіка-хімічнага таварыства, доктар філасофіі ў галіне хіміі, прафесар (1875). З 1868 года працаваў у Пецярбургскім тэхналагічным інстытуце. Аўтар навуковых работ па вывучэнні будовы араматычных злучэнняў.

1943 год — нарадзіўся (в. Валіцкаўшчына Мінскага раёна) Уладзімір Сяргеевіч Улашчык, беларускі вучоны ў галіне фізічнай медыцыны, акадэмік НАН Беларусі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь. У 1986—93 гадах — міністр аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, у 2005—2010-м — дырэктар Інстытута фізіялогіі НАН Беларусі. Аўтар звыш 600 навуковых работ, у тым ліку 30 манаграфій, 80 вынаходстваў і патэнтаў. Навуковыя даследаванні прысвечаны праблемам фізічнай медыцыны і медыцынскай тэхнікі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

У свеце

1700 год — пачалася Паўночная вайна — вайна кааліцыі еўрапейскіх дзяржаў пад назвай Паўночны саюз (Данія, Саксонія, Расія, Рэч Паспалітая, Прусія) супраць Швецыі за панаванне на Балтыйскім моры. З 1704 па 1709 гады асноўнай арэнай баявых дзеянняў была Беларусь, якая панесла вялізныя страты. Вайна працягвалася 21 год і завяршылася паражэннем Швецыі.

1943 год — пачалася высадка дэсанта пад камандаваннем Цэзара Кунікава на Малую Зямлю (г. Новарасійск). Баі доўжыліся 225 дзён, у выніку горад вызвалілі, нямецкім войскам быў перакрыты шлях на Каўказ.

1958 год — у Гаазе падпісаны дагавор аб стварэнні Бенілюкса, эканамічнага саюза Бельгіі, Нідэрландаў і Люксембурга.

Так гаварыў...

ДЭМАКРЫТ:

«Лепш думаць да таго, як дзейнічаць, чым пасля».

УСМІХНЕМСЯ

— Падсудны, вы навошта кінулі камень у прадаўца і разбілі ёй галаву?

— Гэта быў не камень, а яе «свежая булачка»!

Калі адчуеце сябе дурным праз тое, што праехалі свой прыпынак, проста памятайце: у аэрапорце Зальцбурга ёсць інфармацыйнае табло для тых, хто пераблытаў Аўстрыю з Аўстраліяй.

Вось вы кажаце: кава, чай... Нішто так не бадзёрыць з раніцы, як звычайная вада, якая капае са столі!

Яны тры гадзіны захоплена размаўлялі на розныя тэмы — аб музыцы, жывапісе, архітэктуры... Калі ён сказаў, што жанаты, размаўляць адразу не стала пра што.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.744. Індэкс 63850. Зак. № 410.

Нумар падпісаны ў 19.30 2 лютага 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12